# Культурна-масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК “Лунінецкая РЦБС” у кастрычніку

Прайшлі мерапрыемсты, прысвечаныя **Дню пажылых людзей.**
У рамках Рэспубліканскай акцыі “Уважение. Забота. Ответственность”, прымеркаванай да Дня пажылых людзей, у бібліятэках праведзены разнастайныя мерапрыемствы.

**Мікашэвіцкая ГБ** напярэдадні Дня пажылых людзей прайшоў вечар-сустрэча «В гармонии с возрастом» з удзелам натарыуса Мікашэвіцкай натарыяльнай канторы Кузьміна Алега Фёдаравіча.

**ЦРБ ім. Н.Калінковіча.** Супрацоўнікі на працягу дня віншавалі самых актыўных чытачоў «залатога ўзросту». З візітам ветлівасці наведалі сваю калегу – бібліятэкара, якая знаходзіцца на заслужаным адпачынку, Лідзію Барысаўну Кляўцэвіч. Павіншавалі яе са святам, выказалі глыбокую павагу і цёплыя словы падзякі за добрасумленную працу і велізарны жыццёвы вопыт, дабрыню, мудрасць.

**ЦРБ ім. Н.Калінковіча.** У чытальнай зале адбыўся літаратурна-музычны вечар «Осень жизни, как осень года» для ўдзельнікаў народнай літаратурна-паэтычнай студыі «Літаратурная правінцыя». Літаратары чыталі свае восеньскія вершы. Музычныя нумары выканалі Сыціна Галіна, Мікалаевіч Тамара, Брэзіна Галіна, Курыловіч Алена і Яфімава Людміла. Святочны вечар прайшоў у цёплай і сяброўскай атмасферы, усе адпачылі і атрымалі выдатны зарад пазітыву.

**Кажан-Гарадоцкая СБ-К.** прайшлі бібліятэчныя пасядзелкі «Возраст осени прекрасной». Займальныя віктарыны сталі неад'емнай часткай бібліятэчных пасядзелак. Удзельніцы з энтузіязмам успаміналі крылатыя фразы з любімых фільмаў, дзелячыся сваімі ведамі і падтрымліваючы адзін аднаго. Святочная атмасфера нікога не пакінула абыякавым, усе госці атрымалі масу станоўчых эмоцый.

**Рэдзігераўская СБ.** бібліятэкар сумесна з супрацоўнікам сельскага Дома культуры арганізавалі візіты ўвагі, на даму сваіх лепшых чытачоў пажылога ўзросту «Кніга ў жыцці пажылога чалавека». Павіншавалі са святам 97-гадовую Любоў Іванаўну Падлеўскую, самага пажылога чалавека в. Рэдзігерава.

**Азярніцкая СБ-К.** прайшоў урок міласэрднасці «Мудрая осень счастливые мгновения».Таксама бібліятэкар наведала дома сваю калегу, якая цяпер знаходзіцца на залужаным адпачынку Юрцэвіч Ніну Паўлаўну.

**Любанская СБ.** прайшло мерапрыемства «С уважением и почтением к вашим годам». Для наведвальнікаў была прадстаўлена забаўляльная праграма з чытаннем вершаў, разгадваннем загадак. Разам спявалі прыпеўкі, успаміналі гісторыі і выпадкі са свайго жыцця — радасныя і сумныя. Душэўная і цёплая сустрэча завяршылася чаяваннем.

**Лунінецкая ЦРБ імя М.Калінковіча** ў рамках “Недели родительской любви” адбыўся круглы стол “Всё начинается с любви”.

У рабоце круглага стала прынялі ўдзел урач-псіхолаг Лунінецкага РЦГИЭ Святлана Іванаўна Дзмітрыева, урач па медыцынскай прафілактыцы Жанна Леанідаўна Кулеш, настаяцель храма святога дабравернага князя Аляксандра Неўскага іерэй Аляксандр Барысаў і навучэнцы Лунінецкага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа.

Загадчык аддзелам абслугоўвання і інфармацыі Алена Гнедзька пазнаёміла прысутных з тэматычным кутком, дзе прадстаўлены асабістыя рэчы пісьменніка, краязнаўца і журналіста, чыё імя носіць бібліятэка, кніжнымі выставамі «Мікалай Калінковіч – даследчык Палесся» і «Палескія дарогі Аляксандра Блока».

**14 кастрычніка. ЦРБ імя М.Калянковіча** адчыніла свае дзверы бібліякафэ. У дзень мерапрыемства актавая зала бібліятэкі ператварылася ў сапраўднае кафэ: накрытыя абрусам столікі, “сурвэткі” з цытатамі з кніг і святочны торт. На першую сустрэчу ў бібліякафе прыйшлі сябры бібліятэкі, самыя верныя і адданыя яе чытачы і калегі.

З прывітальным словам да прысутных звярнулася дырэктар ДУК “Лунінецкая РЦБС” Ірына Аляксандраўна Лецка. Яна адзначыла, што адкрыццё бібліякафе стане новай старонкай у жыцці бібліятэкі. Гэта месца абяцае стаць кропкай прыцягнення для ўсіх, хто шануе літаратуру, мастацтва і зносіны.

З віншаваннямі і вершамі выступілі ўдзельніцы народнай літаратурна-паэтычнай студыі «Літаратурная правінцыя».

Музычнымі нумарамі гасцей парадавалі Васіль і Марына Рудэнка, удзельніца «Літаратурнай правінцыі» Тамара Мікалаевіч, бібліятэкар Лабчанскай сельскай бібліятэкі Тамара Ермаковіч.

У якасці «чаевых» наведвальнікам было прапанавана пакінуць свае пажаданні і водгукі. *(Лунінецкія навіны №81 ад 22.10.2025г.)*

Прайшлі мерапрыемсты, прысвечаныя **Дню маці і Дню бацькі.**

**13 кастрычніка. Мікашэвіцкая г.б.** “Мама! Лучше всех” - пад такой назвай прайшла гульнявая праграма з удзелам вучняў 7 класа. Дзеці пазнаёміліся з гісторыяй свята, даведаліся, як адзначаюць Дзень маці ў розных краінах свету.

**Да Дня бацькі** для вучняў 6 класа прайшла віктарына “Папа может”. У пачатку мерапрыемства вядучыя расказалі дзецям пра гісторыю ўзнікнення свята Дзень бацькі. Далей вучням была прапанавана віктарына “Наши папы”. Для ўдзельнікаў клуба «САМИ» прайшла пазнавальная гадзіна «Папин день календаря». У рамках акцыі “Я и моя семья – без сквернословия” клірык храма Раства Іаана Прадцечы іерэй Віталь Вароніч распавёў хлопцам, што такое сквернаслоўе, аб згубным уплыве сквернаслоўя на ўнутраны свет і здароўе чалавека.

**З 14 па 21 кастрычніка прайшла “Неделя родительской любви”.**

**ЦДБ**. У рамках нядзелі юныя чытачы паўдзельнічалі ў паэтычным ланцужку «Разукрасим свет стихами...». Бібліятэкары правялі бібліятэчныя урокі «Матуліна калыханка», «Дзень таты».

**Дрэбская СБ-К і Палеская СБ.** былі аб'яўлены конкурсы дзіцячых малюнкаў «Портрет моей семьи» і «Неделя родительской любви».

Таксама бібліятэкар Дрэбскай **СБ-К** правяла тэматычнае мерапрыемства “Дзякуй табе, родная”. Расказала дзецям гісторыю ўзнікнення свята і аб супадзенні яго з вялікім праваслаўным святам – Пакроў Прасвятой Багародзіцы.

**Лунінская СБ.** Прайшла паэтычная гадзіна «Традиции моей семьи». Школьнікі дзяліліся сваімі думкамі, што для іх значыць слова «сям'я», распавядалі пра хатнія традыцыі і нават спаборнічалі ў веданні народных прыказак.

**Бастынская СБ.** Праведзены тэматычны вечар «Всё на Земле от материнских рук», прысвечаны Дню маці. Дзеці чыталі вершы, прысвечаныя мамам, а таксама з задавальненнем і усмешкай разгадвалі жартоўныя загадкі пра мам, дзяцей, сям'ю.

**Бродніцкай СБ-К.** прайшоў тэматычны вечар “Пакрова Багародзіцы — рукі маці".

**Ракітнянская СБ .** Адбыўся цыкл мерапрыемстваў, прысвечаны бацькам. Да Дня Маці бібліятэкар правяла гадзіну добрага слова “Самай лепшай маме”. Да Дня бацькі адбылася літаратурная гадзіна “Ты для мяне прыклад ва ўсім”. У мерапрыемстве прымалі ўдзел вучні 4 класа.

**Міжлеская СБ.** Сумесна з работнікамі Міжлескага сельскага Дома культуры арганізавалі гадзіну дабрыні «Мы будзем вечна праслаўляць тую жанчыну, – чыё імя маці». Запрошаныя мамы падзяліліся апавяданнямі пра сваіх дзяцей, унукаў. У словах кожнай гучала любоў, цеплыня і гонар за сваіх родных.

**Да Дня бацькі ў Рэзігераўскай СБ.** Прайшла гадзіна расказу “Прафесіі нашых тат”, якая пазнаёміла дзяцей з рознымі спецыяльнасцямі: міліцыянта, будаўніка, кіроўцы, агранома, кухары, рэдактара і г.д. А да Дня маці ў бібліятэцы працавала творчая майстэрня “Прыгожая па-свойму кожная мама”.

**Любанская СБ.** Прайшла гадзіна добрых зносін “Бацька – кіраўнік і апора для ўсяго роду”. Татам было прапанавана ўспомніць, як і калі яны прыйшлі да рашэння стварыць сям'ю. Разам успомнілі прыказкі, чыталі вершы пра тату.

**Дзятлавіцкая СБ.** прайшоў майстар - клас па вырабе паштовак «Робім падаруначкі для любімай матулі» і літаратурна-гульнёвы вечар «Тата мой, ты лепшы ў свеце».

**Люшчанская СБ-К.** Прайшла акцыя-віншаванне “З любоўю да бацькоў”. Святочныя канцэрты адбыліся ў **Кажан-Гарадоцкай СБ-К** «Гаварыце мамам далікатныя словы» і **Дрэбскай СБ-К** «Вы адны такія – мілыя, родныя». На мерапрыемствах гучалі жывыя кранальныя нумары, напоўненыя цяплом, удзячнасцю і шчырымі эмоцыямі.

**16 кастрычніка. ЦРБ імя М.Калінковіча.** у сусветны Дзень хлеба прайшло тэматычнае мерапрыемства «Хлеб всему голова».

У рамках мерапрыемства вядучая расказала выхаванцам аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў Лунінецкага ТЦСОН пра значэнне ў жыцці чалавека хлеба, а таксама пра яго ролю ў народных традыцыях. Свае веды ўдзельнікі паказалі, адказваючы на пытанні літаратурнай віктарыны «Хлеб – галоўнае багацце».

Затым для ўдзельнікаў мерапрыемства быў праведзены майстар-клас па вырабе восеньскай аплікацыі. Хлопцы, выяўляючы фантазію, выкарыстоўвалі ў сваіх працах багатую каляровую палітру восені. У выніку былі зроблены прыгожыя арыгінальныя паштоўкі.

**18 кастрычніка. Мікашэвіцкая ГБ.** у рамках пасяджэння клуба па інтарэсах “Почемучка” адбылася гульня-падарожжа «Беларусь – страна со знаком качества», прысвечаная Году Якасці Рэспублікі Беларусь.

У ходзе мерапрыемства вялася размова аб эканамічных дасягненнях краіны, якасці выпрабленай прадукцыі, аб тым, што высокую якасць можна забяспечыць толькі працай. Удзельнікі абмеркавалі пазнавальныя лагатыпы, даведаліся ў якіх гарадах краіны знаходзіцца вытворчасць, цэх, завод тых ці іншых тавараў. З цікавасцю паслухалі паведамленне пра брэнды Беларусі, тавары і прадукты, дзякуючы якім пазнаюць нашу краіну і ведаюць ва ўсім свеце.

Да мерапрыемства была афармлена кніжная выстава-інсталяцыя «Беларусь – страна со знаком качества».

**20 кастрычніка. ЦРБ імя.М.Калінковіча.** У рамках фестывалю праваслаўнай культуры “Кладезь” адбылася літаратурна-музычная сустрэча “Мая душа адкрыта перад вамі...", з Таццянай Мікалаеўнай Дашкевіч. Таццяна Дашкевіч - аўтар мастацкай прозы, дзіцячы пісьменнік, паэтка, які спявае літаратар, член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Расіі.

У рамках творчай сустрэчы аўтар прэзентавала гасцям мерапрыемства свае кнігі і выканала песні ўласнага сачынення. Сустрэча прайшла на адным дыханні, душэўныя песні і апавяданні Таццяны Дашкевіч не пакінулі абыякавымі нікога з прысутных. *(Лунінецкія навіны №82 ад 24.10.2025г.)*

**ЦРБ імя.М.Калінковіча.** У рамках фестывалю праваслаўнай культуры “Кладезь”, адбыліся духоўныя сустрэчы з манахіняй Марыяй (Літвінавай).

**22 кастрычніка** ў духоўна-асветніцкім цэнтры «Истоки», адбылася бяседа на тэму «Без Бога не да парога» на мерапрыемстве прысутнічаў благачынны Лунінецкай царкоўнай акругі, настаяцель храма іконы Божай Маці «Взыскание погибших» пратаіерэй Сергій Крышталь.

На сустрэчы матушка Марыя распавяла пра свой жыццёвы шлях, як яна прыйшла да Бога, якія жыццёвыя каштоўнасці з'яўляюцца сапраўднымі, а якія ілжывымі, да чаго павінен імкнуцца чалавек, што дастаўляе сапраўдную радасць, як Гасподзь дапамагае ў добрых пачынаннях, на чым грунтуецца любоў да Радзімы і патрыятызм, у чым сіла нацыі.

**23 кастрычніка** ў чытальнай зале адбылася яшчэ адна сустрэча на тэму «Як знайсці свой шлях у жыцці» з праглядам фільма «Притчи». Удзел у ёй прынялі настаяцель храма святога дабравернага князя Аляксандра Неўскага

іерэй Аляксандр Барысаў, пажылыя людзі, дзеці з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі і іх бацькі.

Манахіня Марыя падзялілася сваімі думкамі пра тое, як правільна ставіцца да жыцця і радавацца кожнаму дню. Са слоў матушкі Марыі, галоўнае-гэта любіць Бога і людзей, быць удзячным за ўсё, што ёсць, і не шкадаваць пра мінулае, выконваць здаровы лад жыцця. Яна таксама падкрэсліла, што ніколі не позна пачаць нешта новае, вучыцца, развівацца і рабіць дабро. Заклікала ўдзельнікаў сустрэчы не здавацца перад цяжкасцямі, а шукаць пазітыўныя бакі ва ўсім.

**24 кастрычніка ЦРБ імя М.Калінковіча** ў рамках акцыіі па папярэджванню пажараў і гібелі ад іх у жыллёвых фондах “За безопасность вместе” у чытальнай зале бібліятэкі прайшоў урок прававых ведаў “Основы безопастного поведения”. Для вучняў СШ №1 і СШ №4 выступіла старшы інспектар прапаганды і ўзаімадзеяння з грамадкасцю Лунінецкага раённага аддзела па надзвычайным сітуацыям Марына Качура. Напрыканцы мерапрыемства вучні адказалі на пытанні віктарыны “С огнём шутки плохи”.

**26 кастрычніка Мікашэвіцкая ГБ.** у рамках праграмы духоўна-маральнага выхавання «По пути к добру и свету» для ўдзельнікаў васкрэснай школы пры храме Раства Іаана Прадцечы прайшла гадзіна праваславія “Сям'я, сагрэтая любоўю”.

Выступіў іерэй Аляксандр Масяйчук настаяцель храма Раства Іаана Прадцечы, які распавёў дзецям пра брыдкаслоўе, пра тое, што чалавек нясе адказнасць за кожнае прамоўленае слова. Брыдкаслоўем чалавек апаганьвае і абражае, перш за ўсё, самога сябе.

Падчас мерапрыемства дзеці чыталі душэўныя вершы пра бацькоў, а таксама пачулі прытчы «О маме и папе». Затым паўдзельнічалі ў конкурсах «Меню для мамы», «Ларец семейных ценностей», «Семья – буква – Я».

Мерапрыемства атрымалася займальным і цікавым, хлопцы яшчэ раз падкрэслілі для сябе, што згуртаванасць, адзінства, вера, разуменне – самае галоўнае ў сям'і.